Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ



Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

30 лістапада 2011 года, № 18 (2056)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## НА ПАДЫХОДЗЕ СУПЕРКАМП'ЮТАР АД INSPUR

***У адпаведнасці з Праграмай мерапрыемстваў Беларускага інавацыйнага тыдня 17 лістапада ў Беларускім дзяржаўным універсітэце сумесна з БДУІР быў праведзены форум «Беларусь–Кітай».***

У форуме прынялі ўдзел прадстаўнікі дзяржорганаў кіравання (намеснік старшыні ДКНТ А. А. Сільчанка) і Пасольства КНР у Беларусі (першы сакратар па пытаннях навукі Чжан Мін), дэлегацыя Народнага ўрада г. Харбін на чале з намеснікам начальніка Упраўлення навукі і тэхнікі Сун Баянем, прадстаўнікі кітайскіх даследчых арганізацый, буйных IT-кампаній, кітайскія і беларускія аспіранты і студэнты, прадстаўнікі беларускіх навуковых і прамысловых арганізацый.

Была разгорнута планшэтная выстава з навуковымі распрацоўкамі БДУ і БДУІР. Прагучала больш за 20 дакладаў па перадавых навукова-тэхнічных распрацоўках з галін фізікі, хіміі, матэматыкі, інфарматыкі, радыётэхнікі і электронікі.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Прарэктар па навуковай рабоце БДУ акадэмік Алег Івашкевіч падпісаў пагадненне з намеснікам начальніка Упраўлення навукі і тэхнікі Народнага ўрада г. Харбін Сун Баянем*

Па выніках форуму падпісана папярэдняе пагадненне аб сумесным праекце па стварэнні ў БДУ новага суперкамп'ютара. Партнёрам з кітайскага боку выступае кампанія INSPUR – адна з найбуйнейшых у свеце IT. Мяркуецца, што гэты праект будзе ўключаны ў міждзяржаўную Праграму навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва на 2012 г. Акрамя таго:

- Падпісаны мемарандумы паміж БДУ і Упраўленнем навукі і тэхнікі Народнага ўрада г. Харбін аб адкрыцці офісаў Беларуска-кітайскага інавацыйнага цэнтра ў Харбіне і Мінску, а таксама аб сумеснай падрыхтоўцы да ўдзелу ў Харбінскай міжнароднай выставе навукова-тэхнічных дасягненняў, якая плануецца ў чэрвені 2012 г.;
- Паміж БДУ і Інстытутам нафтахіміі Акадэміі навук правінцыі Хэйлунцзян дасягнута пагадненне аб сумесным выкананні праекта «Ізаляцыйныя пакрыцці, якія вытрымліваюць тэмпературу да 1500° С»;
- Падпісана пагадненне паміж Ханжоўскім універсітэтам электронікі (правінцыя Чжэцзян) аб стварэнні сумеснага Беларуска-кітайскага цэнтра ў правінцыі Чжэцзян;
- Паміж БДУ і Чжэцзянскім акіянаграфічным універсітэтам дасягнута дамоўленасць аб адкрыцці сумеснай навуковай лабараторыі марскіх тэхналогій. Зараз у гэтай кітайскай ВНУ знаходзіцца даследчая група з БДУ, якая выконвае работы па стварэнні эфектыўных антыкаразійных саставаў для абароны марскіх судоў і берагавых збудаванняў.

**Паводле інфармацыі Беларуска-кітайскага інавацыйнага цэнтра БДУ**

ВІЗІТЫ

## Пра місію праваслаўнай царквы і цуды Ватапеда

***Ігумен Ватапедскага манастыра святой гары Афон архімандрыт Яфрэм 16 лістапада наведаў наш універсітэт. Ён сустрэўся з выкладчыкамі і слухачамі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, а таксама выступіў у зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ.***



На сустрэчы са студэнтамі айцец Яфрэм выказаў занепакоенасць, што сёння людзі звернутыя больш на навакольны свет, а не на духоўнасць. Паводле яго слоў, знайсці свае ўнутраныя скарбы не дае тэхналагічны прагрэс, які імкліва развіваецца ў сучаснасці. Айцец ігумен таксама адзначыў велізарную місію праваслаўнай царквы па пераадоленні наступстваў атэістычнай эпохі.

Дарэчы, як распавёў архімандрыт Яфрэм, у манастыр чалавек ідзе не таму, што ён расчараваўся ў гэтым свеце ці ў яго не склалася асабістае жыццё – сёння большасць манахаў Ватапедскай абіцелі (каля 80 %) маюць вышэйшую адукацыю. У манастыр прыходзяць урачы і суддзі, за плячыма якіх дыпломы і доктарскія працы.

Затым архімандрыт Яфрэм расказаў пра цуды, якія здзяйсняюцца ў сценах манастыра благаславеннем пачэснага пояса Найсвяцейшай Багародзіцы. Некалькі дзён пояс Маці Божай знаходзіўся ў Маскве, дзе ля Храма Хрыста Збаўцы сабраліся тысячы вернікаў, якія хацелі дакрануцца да ўнікальнай хрысціянскай рэліквіі.

У канцы сустрэчы айцец адказаў на пытанні студэнтаў. Маладых людзей цікавіла, якія грахі лічацца смяротнымі, як загладзіць грэх аборту і як гарманічна спалучаць кар'еру і сям'ю. Адказваючы на апошняе пытанне, архімандрыт Яфрэм заўважыў, што разумная жанчына зможа сумяшчаць і працу, і сямейнае прызначэнне. «Тая, якая мае шмат дыпломаў, але грэбуе дзецьмі, для мяне няўдачніца», – падкрэсліў манах.

Ішла размова і пра сайт *www.pemptousia.ru* (інтэрнэт-выданне грамадства сяброў Свяшчэннай Вялікай Абіцелі Ватапед), дзе ў раздзел «Навука» могуць дасылаць свае працы маладыя навукоўцы.

Акрамя таго, студэнты змаглі на некалькі хвілін акунуцца ў атмасферу Ватапедскага манастыра дзякуючы дакументальнаму фільму пра абіцель «Пояс Багародзіцы».

На развітанне архімандрыт Яфрэм перадаў прарэктару па вучэбнай рабоце БДУ Уладзіміру Клюню спіс іконы «Радасць і суцяшэнне».

Наведванне БДУ адбылося ў рамках візіту ў Беларусь грэчаскай дэлегацыі па запрашэнні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

**Святлана ВАСІЛЕЎСКАЯ**

*P.S. Ватапедскі манастыр – другі па іерархіі на Афоне, уяўляе сабой адасобленую манаскую рэспубліку ў складзе Грэцыі. Афонскія манастыры не з'яўляюцца часткай Грэчаскай (Элладскай) царквы, а знаходзяцца ў юрысдыкцыі Усяленскага Канстанцінопальскага патрыярхату.*



### Чытайце ў нумары:

**УЗАЕМНЫ ПЛЁН І ПТУШЫНАЙ МОВАЙ**
Гутарка з маладымі навукоўцамі – лаўрэатамі прэмій імя У. Пічэты і А. Сеўчанкі 2011 г.
Стар. 2

**ЗАСНАВАЛЬНІКУ КАФЕДРЫ САЦЫЯЛОГІІ БДУ ПРАФЕСАРУ АЛЬБЕРТУ ЕЛСУКОВУ – 75 ГАДОЎ!**
Стар. 3

**ДЛЯ КАГО ЗАЦВІЛА ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА?**
Лаўрэаты штогадовай універсітэцкай віктарыны сёлета вылучыліся ў адшуканні малавядомых фактаў з гісторыі БДУ
Стар. 4

### Весткі з рэктарата

ПЕРШЫ прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў і прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Панарадаў наведалі Кубу з 23 па 29 лістапада. Адной з галоўных падзей стала сустрэча з першымі выпускнікамі факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ. Грамадзяне вострава Свабоды сталі слухачамі ФДА ў 1961 г. і паклалі пачатак падрыхтоўцы замежных спецыялістаў у Беларусі. Госці правялі перамовы ў Міністэрстве адукацыі, а таксама наведалі вядучыя ўніверсітэты.

БДУ разам з Беларускім інавацыйным фондам і Партызанскім райвыканкамам сталіцы выступілі заснавальнікамі Мінскага гарадскога тэхнапарка, які быў зарэгістраваны 28 верасня.

Праект скіраваны на стварэнне спрыяльных умоў для развіцця інавацыйнага бізнесу і высокатэхналагічных вытворчасцяў. Рэзідэнты тэхнапарка будуць карыстацца льготамі і прэферэнцыямі, вызначанымі заканадаўствам. Склад заснавальнікаў тэхнапарка (прадстаўнікі мясцовых органаў улады, фінансавая арганізацыя і ВНУ) сведчыць пра стварэнне ў краіне структуры, якая цалкам адпавядае еўрапейскім аналагам.

ЧАЦВЁРТАЯ міжнародная навуковая канферэнцыя «Кітай у сучасным свеце» прайшла ў БДУ з 24 па 26 лістапада. Яе ўдзельнікамі сталі больш за 50 кітаязнаўцаў, культуролагаў, гісторыкаў, эканамістаў і педагогаў з Беларусі, Расіі і Кітая. У рамках канферэнцыі быў таксама арганізаваны другі форум маладых навукоўцаў «Вопыт і дасягненні сучаснага Кітая». Арганізатар – Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

*Надоечы ў БДУ былі ўручаны галоўныя навуковыя ўзнагароды – прэміі У. І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук і А. Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук за 2011 год. Сярод прызнаных навукоўцаў у адмысловай намінацыі традыцыйна адзначаны і маладыя. Прадстаўляем гэтых таленавітых асоб вашай увазе.*

# УЗАЕМНЫ ПЛЁН У ФІЗІЦЫ

***Загадчык лабараторыі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі фізічнага факультэта кандыдат фізіка-матэматычных навук Ксенія ЕРМАЛІЦКАЯ разам з дацэнтам кафедры фізікі цвёрдага цела фізічнага факультэта кандыдатам фізіка-матэматычных навук Наталляй ПОЛЯК сталі лаўрэатамі прэміі імя А. Н. Сеўчанкі за цыкл прац «Склад, структура і механічныя ўласцівасці шматкампанентных канструкцыйных сплаваў».***



Фота Яўгена ПАМЫТКІНА

***– У якіх галінах ваша распрацоўка можа атрымаць прымяненне?***

*Наталля Поляк:* Наша сумесная з Ксеніяй работа прысвечана вывучэнню аднаго з найбольш перспектыўных класаў металічных матэрыялаў, якія атрымалі назву дысперсійна цвярдзеючых. Гэтыя сплавы шырока прымяняюцца ў авіябудаўніцтве і тэхніцы, у тым ліку атамнай і касмічнай галінах. Нашы даследаванні былі накіраваны на стварэнне методык, якія дазваляюць вызначаць элементны склад і канцэнтрацыю прымесяў у гатовым вырабе пры мінімальным пашкоджанні яго паверхні. Акрамя гэтага, намі былі вывучаны структура і фізіка-механічныя ўласцівасці сплаваў пры розных знешніх уздзеяннях.

***– Як завязалася ваша сумесная праца?***

*Ксенія Ермаліцкая:* Мы з Наталляй сустракаліся на навуковых канферэнцыях і мерапрыемствах, у тым ліку і тых, якія праводзіліся саветам маладых вучоных фізічнага факультэта. Абмяркоўваючы розныя пытанні, мы нечакана высветлілі, што даследуем адны і тыя ж аб'екты, калі так можна сказаць, з розных бакоў. Так, мяне ў большай ступені цікавіла магчымасць маларазбуральнага колькаснага аналізу гатовых вырабаў з бірыліевай бронзы і дзюралюмінію. Наталля ж займалася даследаваннем змяненняў структуры і ўласцівасцяў гэтых сплаваў пры розных знешніх уздзеяннях. Практычна адразу ж узнікла ідэя сумеснай навуковай працы, якую падтрымалі нашы навуковыя кіраўнікі – Віктар Міхайлавіч Анішчык і Яўген Сямёнавіч Варапай. У выніку з'явіўся цэлы цыкл прац, а я пры гэтым значна пашырыла свае веды ў фізіцы цвёрдага цела, Наталля ж шмат новага здабыла для сябе ў лазернай спектраскапіі.

***– Для такіх даследаванняў неабходнае адпаведнае абсталяванне…***

*Ксенія Ермаліцкая:* Наша даследаванне адносіцца да прыкладной навукі і амаль цалкам заснавана на эксперыментах. Таму нават наш сумесны з Наталляй энтузіязм, а таксама вопыт і веды нашых кіраўнікоў, без адпаведнай матэрыяльнай базы не дазволілі б выканаць і сотай долі тых даследаванняў, якія намі былі праведзены. Практычна ўся праца выконвалася ў Беларускім міжуніверсітэцкім цэнтры абслугоўвання навуковых даследаванняў, які быў створаны на базе фізічнага факультэта, на прыборах кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, кафедры фізікі цвёрдага цела і лабараторыі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі.

***– Якія вашы далейшыя творчыя планы?***

*Наталля Поляк:* Атрыманыя вынікі будуць садзейнічаць развіццю ўяўленняў пра заканамернасці і механізмы структурна-фазавых змяненняў у сплавах, неабходных пры распрацоўцы тэхналагічных працэсаў стварэння матэрыялаў. Распрацаваныя методыкі даследавання даволі ўніверсальныя, бо могуць прымяняцца для вывучэння і іншых сплаваў. Такіх аб'ектаў даследавання вялікая колькасць. Таму мы плануем сканцэнтраваць увагу на рашэнні канкрэтных задач, якія існуюць у беларускай металургічнай прамысловасці.

**Гутарыла**
**Ганна ЛАГУН**

# ПТУШЫНАЙ МОВАЙ

***Пра фразеалагізмы з кампанентамі-арнітонімамі (назвамі птушак), сініцу ў руках і жураўля ў небе распытваем дацэнта філалагічнага факультэта кандыдата філалагічных навук Анжаліку САДОЎСКУЮ – лаўрэата прэміі імя У. І. Пічэты для маладых вучоных.***



Фота Яўгена ПАМЫТКІНА

***– Палова Вашай кнігі прысвечана тэарэтычным пытанням – што такое этналінгвістыка, этнафразеалогія, якія навуковыя школы існуюць у славянскіх народаў, якія сфарміраваліся асноўныя напрамкі беларускай этналінгвістыкі… А другая палова – непасрэдны этналінгвістычны аналіз фразеалагічнага фрагмента. Чаму менавіта з «птушыным» кампанентам?***

– Менавіта ім – птушкам – адведзена асаблівая роля ў міфапаэтычнай карціне свету, бо іх вобразы нясуць у сабе сляды глыбокай міфалагічнай архаікі і ў той жа час поўняцца назіраннямі над навакольнем, над жывёламі і над самім чалавекам. Да таго ж, назвы птушак, як і назвы жывёл наогул, выступаюць істотным фраземаўтваральным элементам, што дыктуецца значнасцю адпаведных рэалій у практычным і духоўным жыцці чалавека. У «птушынай» фразеалогіі знаходзяць адлюстраванне і ацэначную характарыстыку (згодна са складзенымі спрадвеку грамадскімі нормамі) такія ўніверсальныя пласты карціны свету, як «узаемаадносіны мужчыны – жанчыны», «узаемаадносіны бацькоў – дзяцей», «адносіны да ўласнага дома, да радзімы»; «жыццёвыя прыярытэты» і інш. Птушка выступае ў беларусаў як міфапаэтычны класіфікатар і сімвал божай існасці, верху, неба, прыродных стыхій і з'яў (сонца, грому, ветру, хмары, маланкі, агню), свабоды, волі, вызвалення, жыцця, урадлівасці, шчасця і багацця, прадказання, сувязі паміж касмічнымі зонамі, душы, духу жыцця, вечнасці і бессмяротнасці і інш.

***– Дазвольце адрасаваць Вам улюбёнае пытанне сённяшняй грамадскасці да навукоўцаў-гуманітарыяў: ці ёсць практычная карысць у Вашым даследаванні – вывучэнні фразеалагізмаў?***

– Даследаванне выканана ў рэчышчы двух новых міждысцыплінарных навуковых кірункаў – этналінгвістыкі і этнафразеалогіі. Гэта перспектыўныя напрамкі, бо для сучасных беларусаў праблема захавання і вывучэння духоўнай спадчыны вельмі актуальная: нацыянальная мова з яе генетычнай народна-культурнай асновай для сённяшняй пасіўнай большасці страчвае, на жаль, свой глыбока этнічны сімвалічны змест, што пагражае прывесці да разбурэння беларускай этнакультурнай прасторы ўвогуле. Сучасная моладзь апынулася ў сітуацыі этычнага плюралізму, што прыводзіць у сваім негатыўным праяўленні ўвогуле да ігнаравання прынцыпаў натуральнага маральнага закону, выпрацаванага нашымі продкамі. Для самазахавання ў такой сітуацыі мы мусім звяртацца да думак і светаўспрымання сваіх продкаў, да іх духоўнай спадчыны і маральна-этычных каштоўнасцяў, разгубіўшы якія, сучаснае грамадства пакуль не выпрацавала больш дасканалых. Этналінгвістыка ж якраз і мае на мэце семантычную рэканструкцыю традыцыйнай (архаічнай, міфапаэтычнай у сваёй аснове) карціны свету, светапогляду, сістэмы каштоўнасцяў.

Разам з тым, прапанаваную манаграфію можна разглядаць не толькі як навуковае даследаванне, у якім асвоены цэлы пласт фразеалагізмаў з кампанентам-арнітонімам, даюцца шматлікія культурна-гістарычныя звесткі, каштоўныя для фразеалагічнай этымалогіі, але і як вучэбны дапаможнік па распрацаваных мной вучэбным курсе «Беларуская этналінгвістыка» і навуковым семінары «Нацыянальна-культурны кампанент беларускай фразеалогіі», якія выкладаюцца на філалагічным факультэце. Таму кніга ўжо знайшла свайго адрасата і скіравана ў тым ліку на паглыбленне, паляпшэнне ведаў і кругагляду нашых выпускнікоў. А жывы ілюстрацыйны матэрыял, прааналізаваны ў манаграфіі, шчыра спадзяюся, здольны абудзіць цікавасць і павагу да роднага слова і духоўнай спадчыны нашых таленавітых продкаў у кожнага чытача.

***– Як пачуваецца сёння малады вучоны ў БДУ?***

– І арганічна, і гарманічна. З аднаго боку, відаць, таму, што ў апошнія гады цікавасць і ўвага ў БДУ да асобы маладога вучонага значна ўзрасла. Два гады таму створаны савет маладых вучоных БДУ, такія ж саветы арганізаваны і дзейнічаюць на ўсіх факультэтах, нас усебакова падтрымліваюць кіраўніцтва ўніверсітэта і факультэта, ну і, зразумела, калегі… Маладому вучонаму не так шмат трэба – добрае слова ў час, і ён усімі сіламі імкнецца апраўдаць атрыманы авансам давер. Сведчаннем такога даверу з'яўляецца і намінацыя «маладыя вучоныя» ў конкурсе на атрыманне ганаровай прэміі У. І. Пічэты. З іншага боку, маральны абавязак кожнага чалавека – гарманічна і ўтульна адчуваць сябе на тым жыццёвым шляху, які ён сам сабе свядома выбірае. Так і я, радасць жыцця бачу ў яго спасціжэнні, а дасягненне – гэта таксама хараство спасціжэння.

**Гутарыла**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**


**ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**

**ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ**

аб'яўляе набор слухачоў на перападрыхтоўку па спецыяльнасцях:

**«Сродкі масавай інфармацыі»**
з прысваеннем кваліфікацыі
**«Журналіст»**

Праграма навучання грунтуецца на сучасных эфектыўных формах і метадах навучання з выкарыстаннем сучаснай камп'ютарнай, відэа-, мультымедыятэхнікі і найноўшых тэхналогій, дыдактычных і метадычных матэрыялаў.

- Навучанне ажыццяўляецца па завочнай форме на платнай аснове.
- Тэрмін навучання – 20 месяцаў (4 сесіі).
- Тэрміны прыёму дакументаў з 1 верасня да 20 студзеня.
- Тэрмін залічэння на перападрыхтоўку да 1 лютага.
- Графік вучэбнага працэсу (сесіі) – люты, верасень.

По заканчэнні навучання выдаецца **дыплом дзяржаўнага ўзору.**

НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ ЗАПРАШАЮЦЦА:
- асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю;
- студэнты дзённай формы навучання двух апошніх курсаў;
- асобы, якія навучаюцца ў магістратуры і аспірантуры.

**«Камунікацыя ў сферы грамадскіх сувязяў»**
з прысваеннем кваліфікацыі
**«Спецыяліст па камунікацыі ў сферы грамадскіх сувязяў»**

- Навучанне ажыццяўляецца па завочнай форме на платнай аснове.
- Тэрмін навучання – 20 месяцаў (4 сесіі).
- Тэрміны прыёму дакументаў з 1 верасня да 26 лютага.
- Тэрмін залічэння на перападрыхтоўку да 26 лютага.
- Графік вучэбнага працэсу (сесіі) – сакавік, кастрычнік.

По заканчэнні навучання выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору.

НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ ЗАПРАШАЮЦЦА:
- менеджары і спецыялісты з вышэйшай адукацыяй;
- практыкі, якія працуюць у сферы грамадскіх сувязяў і не маюць прафесійнай падрыхтоўкі;
- асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю;
- студэнты дзённай формы навучання двух апошніх курсаў;
- асобы, якія навучаюцца ў магістратуры і аспірантуры.

Мэта праграмы – прафесійная падрыхтоўка PR-спецыялістаў для арганізацый Рэспублікі Беларусь.

**Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 416, 417, 503**
**Кантактныя тэлефоны: 259-70-72, 259-70-15**
**Тэл./факс: 259-70-16**
**E-mail: jour_fpk@bsu.by**
**http://www.journ.bsu.by**

ВІНШУЕМ!

# Патрыцый філасофскай і сацыялагічнай думкі

***Заснавальніку кафедры сацыялогіі БДУ прафесару Альберту ЕЛСУКОВУ – 75 гадоў!***



Альберт Мікалаевіч падышоў да свайго юбілею прызнаным навукоўцам, патрыцыем філасофскай і сацыялагічнай думкі. Як і яго любімы антычны мысляр Платон, ён у сталым узросце перажывае пару творчага росквіту. Паранейшаму шмат працуе, штогод з-пад яго пяра выходзяць новыя кнігі, падручнікі, навуковыя артыкулы. У ім гарманічна спалучаецца яркі лектар, уважлівы слухач і разумны суразмоўца. Пасля сарака гадоў працы ў БДУ прафесар А. М. Елсукоў – годны прыклад працавітасці і высакароднасці.

У 1958 г. Альберт Елсукоў паступіў на гістарычны факультэт БДУ. Асаблівую цікавасць у яго выклікалі лекцыі па гісторыі філасофіі, якія чытаў прафесар І. М. Лушчыцкі, і лекцыі па дыялектычным матэрыялізме прафесара П. Ф. Пратасені. Хапала часу і для грамадскай працы: спяваў у акадэмічным хоры Палаца культуры прафсаюзаў, займаўся спортам (меў першы спартыўны разрад па фехтаванні), усе канікулы працаваў у піянерскіх лагерах, быў удзельнікам студэнцкіх будаўнічых атрадаў. На старэйшых курсах працаваў на грамадскіх пачатках кіраўніком лектарскай групы Мінскага гаркама камсамола. Універсітэт падрыхтаваў Альберта Мікалаевіча да самастойнага жыцця, таму ён спакойна прыняў сваё размеркаванне настаўнікам у далёкую сельскую школу. Там ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай, якая таксама прыбыла туды пасля заканчэння філфака БДУ.

Усё далейшае жыццё Альберт Мікалаевіч вучыўся і вучыў іншых: настаўнічаў у пасёлку Опса Браслаўскага раёна, выкладаў філасофію ў Беларускім політэхнічным інстытуце. У 1966 г. ён паступіў у аспірантуру філасофскага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава. Там вызначыласа цікавасць А. М. Елсукова да праблем гісторыі, філасофіі і метадалогіі навукова-пазнавальнай дзейнасці. Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі ў 1969 г. ён вярнуўся ў БПІ.

З 1973 г. жыццё А. М. Елсукова звязана з БДУ. Ён пачаў працу на кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, дзе сабралася шмат цікавых выкладчыкаў, якія мыслілі па-сучаснаму, і перш за ўсё прафесары Г. П. Давідзюк і В. С. Сцёпін, а таксама шмат таленавітай моладзі. На чале з В. С. Сцёпіным пачала фарміравацца беларуская школа метадалогіі навуковага пазнання, якая дзейнічала ў 1970–1980-ыя гады. Дзякуючы ёй універсітэт стаў усесаюзным цэнтрам па вывучэнні праблем гісторыі і метадалогіі навукі. На кафедры сталі рэгулярна праводзіцца міждысцыплінарныя канферэнцыі, метадалагічныя семінары, з'яўляцца сур'ёзныя навуковыя публікацыі, падрыхтаваныя сумесна з вядучымі навукоўцамі Масквы і Ленінграда. У 1985 г. А. М. Елсукоў абараніў доктарскую дысертацыю, якая знайшла сваё адлюстраванне ў манаграфіі «Эмпірычнае пазнанне і факты навукі» (1981).

Сярод дасягненняў прафесара А. М. Елсукова вылучаецца яго ўдзел у адкрыцці ў 1989 г. першага ў Беларусі сацыялагічнага аддзялення і кафедры сацыялогіі на новым філасофска-эканамічным факультэце БДУ, які прыйшлося ствараць з нуля.

БДУ даў Альберту Елсукову пуцёўку ў жыццё. Тут ён здолеў дарасці да прафесара, загадчыка кафедры і дэкана. За плячыма А. М. Елсукова каласальны вопыт педагагічнай і навуковай дзейнасці. Ён умее ладзіць з людзьмі, ніколі не адмаўляецца дапамагчы калегам па працы, студэнтам і аспірантам (пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронена больш за 30 дысертацый). А. М. Елсукоў – выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2006), лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты БДУ (2009).

З нашай першай сустрэчы Альберт Мікалаевіч застаецца для мяне чалавекам, непадуладным уплыву часу: як заўсёды, па-спартыўнаму падцягнуты, рашучы, заўсёды галантны і артыстычны. Ён і цяпер увесь у працы і, як правіла, кудысьці спяшаецца. У такім выпадку застаецца толькі пажадаць нашаму юбіляру: «Так трымаць»...

**Прафесар Аляксандр ДАНІЛАЎ,**
**загадчык кафедры сацыялогіі**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Перш папрацуй, а тады й патанцуй

***У кастрычніку нашаму ўніверсітэту споўнілася 90 гадоў, факультэт міжнародных адносін адзначаў свае 16, а кафедра англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў – дзесяцігоддзе.***

Таму студэнты, якія вывучаюць менеджмент у сферы міжнароднага турызму, у гонар такога трайнога свята ўспомнілі сваю ўлюбёную англійскую прымаўку *all work and no play makes Jack adull boy* (ад адной працы без забавак засмуткуе і Джэк) і падрыхтавалі вясёлы студэнцкі канцэрт, дзе перамяшаліся сцэны з класічных англійскіх п'ес і нумары, у якіх віравалі студэнцкая выдумка, запал і гумар.

Па традыцыі на канцэрт з віншаваннямі прыйшлі «дзеткі» з дзіцячага садка з паглыбленым вывучэннем англійскай. У бантах, дзіцячых штоніках, кароценькіх спаднічках і з любімымі цацкамі пад агульны рогат выступілі, вядома, самі студэнты. Яны прадэманстравалі сваё суперваладанне класічнымі англійскімі скорагаворкамі і дзіцячымі вершамі. Пры гэтым студэнты выявілі не толькі добрае валоданне мовай, але і веданне культуры Вялікабрытаніі.

Перад гледачамі ў пышных строях канца XVIII–пачатку XX стст. прадстаўлены сцэны з класічных п'ес Р. Шэрыдана і О. Уайльда «Школа зласлоўя» і «Як важна быць сур'ёзным» у выдатным творчым і моўным выкананні студэнтаў 4–5 курсаў А. Несцяронка, М. Казарынай, Я. Корсак, Д. Варанец, К. Янчогла, А. Кап'ёва, Я. Бадак, А. Зубракова, Г. Драздова.



А потым уся зала падпявала квартэту студэнтак 5 курса, якія прафесійна на некалькі галасоў выканалі на англійскай мове меладычныя песні і проста зачаравалі слухачоў.

А яшчэ, памятаючы пра тое, што нашы студэнты – міжнароднікі, яны прыдумалі інсцэніроўку «палітычна карэктнага перакладу» дзіцячай казкі «Тры парасяты».

Гледачы доўга не адпускалі радасных і крыху збянтэжаных выканаўцаў. Канцэрт быў падрыхтаваны студэнтамі з душой, і, як кажуць, *what comes from heart goes straight to heart*. Бо, па сутнасці, у памяці застаецца не толькі інфармацыя, якую мы набываем, вывучаючы прадметы, але больш за ўсё нашы пачуцці, перажыванні, г. зн. тое, што так ці інакш звязана з сэрцам. І яшчэ падумалася, як усё-ткі шмат у нас на факультэце таленавітых, здольных людзей, але яны часам сарамеюцца праявіць свае таленты, сціпла сябе паводзяць, аднак калі ўжо разгорнуцца – то дзіву даешся!

**Дацэнт Альбіна ТАРЖОК,**
**кіраўнік студэнцкага тэатра**
**на англійскай мове**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# Віртуальнае падарожжа

Надоечы ў межах дысцыпліны «Канстытуцыйнае права» выкладчыкамі кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта – дацэнтамі А. В. Шаўцовай, Т. С. Маслоўскай і старшым выкладчыкам Т. У. Навумовіч праводзіліся семінарскія заняткі ў студэнтаў 2 курса па тэме «Адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад Рэспублікі Беларусь». Яны атрымаліся настолькі займальнымі і інфарматыўнымі, што мы вырашылі падзяліцца сваімі ўражаннямі з чытачамі газеты.

Студэнты павінны былі не толькі прааналізаваць дзейнае заканадаўства ў гэтай галіне і азнаёміцца з дыскусійнымі навуковымі пытаннямі, але таксама падрыхтаваць аповед пра свой родны горад, мястэчка, вёску – пра сваю малую радзіму. Такі «асабісты» падыход выклікаў асаблівую зацікаўленасць у студэнтаў, бо інфармацыя насіла не проста тэарэтыка-прававы характар, але была часткай уласнай біяграфіі кожнага.

Кожны са студэнтаў з натхненнем прадстаўляў месца, дзе нарадзіўся і вырас, шматлікія выступленні суправаджаліся маляўнічымі прэзентацыямі. Хлопцы і дзяўчаты знаёмілі адзін аднаго з развіццём гаспадаркі, дэмаграфіі, адукацыі, а таксама з гісторыяй і славутасцямі сваіх населеных пунктаў. Некаторыя студэнты, па іх словах, дзякуючы такому заданню ўпершыню даведаліся шмат новага пра родныя мясціны.

Такі падыход да засваення вучэбнага матэрыялу не толькі спрыяе фарміраванню прафесійных навыкаў, прывыканню да юрыдычнай лексікі, але і ўзмацняе патрыятычныя пачуцці моладзі.

Пасля такіх цікавых заняткаў студэнты падзякавалі сваім выкладчыкам, а таксама выказалі пажаданне далей вывучаць канстытуцыйнае права праз асабісты вопыт і ўдзел.

**Аліна БАГАЛЕЙКА,**
**выкладчык юрыдычнага факультэта**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**
**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва, крыніцазнаўства, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Расіі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, сучаснай беларускай мовы,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: крыніцазнаўства, нямецкага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, раманскага мовазнаўства.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**
**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры прававых дысцыплін – (1),

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры мастацтваў – (1).

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, ДІКСТ, аддзел кадраў, тэл.: 306-00-28.*

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Стварэнне Мінскага гарадскога тэхнапарка, адным з заснавальнікаў якога стаў БДУ** – БелТА, rambler.ru, 100storon.ru, reporter.by, telegraf.by, novostimira.com (17.11), БелаПАН, naviny.by, 21.by (18.11).

**Правядзенне Дзён псіхалогіі ў БДУ** – «Минск-новости» (14.11), «Настаўніцкая газета» (17.11).

**Форум маладых выкладчыкаў рускай мовы, аспірантаў і студэнтаў-русістаў у БДУ** – БелТА, 21.by, zn.by (16.11), «Минск-новости» (17.11), soyuz.by (20.11), poisknews.ru (18.11), russkie.org (17.11), rg.ru (17.11), spravda.ru (17.11).

**Да Міжнароднага дня студэнта** – tut.by (16.11, 17.11), 21.by (17.11).

**Праграма бібліятэкі Інстытута журналістыкі «Ноч у бібліятэцы»** – «Рэспубліка», respublika.info, 21.by (15.11).

**Адкрыццё выставы «Студетство», падрыхтаванай Студэнцкім саюзам БДУ да 90-годдзя БДУ** – «Минск-новости» (15.11), БелаПАН (16.11), «Настаўніцкая газета» (17.11); tut.by (17.11), «Вечерний Минск» (19.11), vminsk.by (21.11).

**Форум «Беларусь–Кітай», арганізаваны БДУ і БДУІР** – radiominsk.by (10.11), govorim.by (14.11); my-minsk.ru, «Минск-новости», 21.by (14.11, 17.11); zn.by, БелТА (17.11).

**Пра дзейнасць дзённых і завочных школ для абітурыентаў на фізічным факультэце БДУ** – «Настаўніцкая газета» (10.11).

**Поспехі студэнтаў-праграмістаў БДУ на міжнародных спаборніцтвах** – БелТА, «Минск-новости», zn.by, sb.by, 21.by, tut.by, raskrutka.by, bna.by, ehu.by, govorim.by, ania-news.info, moyby.com (10.11), newskey.ru (11.11), techlabs.by, freesmi.by (11.11), «Рэспубліка», respublika.info (12.11).

**Першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў распавядае пра новы корпус БДУ на Прывакзальнай плошчы** – ej.by, date.bs, tut.by, 21.by (08.11); АТН БТ (10.11).

**Пра прэпарат «Цысплацэл», распрацаваны НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ** – БелТА, open.by, БелаПАН, naviny.by (08.11), reporter.by (09.11).

